Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
30 САКАВІКА 2013 г. СУБОТА № 59 (27424) Кошт 1500 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 31 сакавіка 2013 года

*Паважаныя суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас са святам Вялікадня.*

*Штогод мільёны вернікаў ва ўсім свеце схіляюцца перад бязмернай веліччу ахвярнасці Хрыста. Як вясновыя прамяні саграваюць зямлю, так Хрыстова Уваскрэсенне ўмацоўвае духоўнасць, адраджае веру ў дабро і справядлівасць, дорыць святло радасці.*

*Вялікдзень — сімвал абнаўлення і міралюбнасці, жыватворны выток асноў хрысціянскага гуманізму. Ён заклікае да імкнення жыць у любові, працаваць сумленна, дапамагаць тым, хто мае патрэбу ў клопаце і ўвазе.*

*Няхай свята Уваскрэсення стане для вас невычэрпнай крыніцай надзеі і дапамогі ў дасягненні самых запаветных жаданняў і імкненняў, натхніць і надасць сіл у стваральнай працы дзеля будучыні кожнай сям'і і роднай Беларусі.*

*Шчыра зычу вам здароўя, поспехаў у справах і пачынаннях, шчасця і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# АБНОЎЛЕНАЯ КЛАСІКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў унесці прапановы, каб вывесці дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы на самаакупнасць. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора ў час даклада міністра культуры Барыса Святлова аб выніках рэканструкцыі тэатра, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка ўдзельнічаў учора ў адкрыцці тэатра імя Янкі Купалы пасля рэканструкцыі.

Як праінфармаваў Барыс Святлоў, праведзеная рэканструкцыя дала магчымасць унесці тэхнічныя навацыі, выкарыстоўваць новыя тэхналогіі ў пастаноўцы спектакляў. Размова ішла і аб далейшай фінансавай дзейнасці гэтай тэатральнай установы. «Сёння гэта не самаакупная арганізацыя. Можа, давайце дадзім ім магчымасць зарабіць, вызвалім ад падаткаў і паглядзім, што атрымаецца, — заўважыў Прэзідэнт. — Яны гатовы, як на Захадзе, у свабоднае плаванне?»

Прадстаўнікі Міністэрства культуры і кіраўніцтва тэатра адзначылі, што некаторыя датацыі для дзейнасці тэатра ўсё ж спатрэбяцца. Прэзідэнт сказаў, што трэба падумаць і ўнесці адпаведныя прапановы, якія датычацца фінансавай дзейнасці тэатра.

# КАЛІ НЕБА СУСТРАКАЕЦЦА З ЗЯМЛЁЙ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заўтра каталікі ўсяго свету адзначаюць Вялікдзень, асноўнае свята хрысціянскага календара. СТАР. 3

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Барыс БАТУРА, старшыня Мінаблвыканкама:**

***«Увага да развіцця асабістых падсобных гаспадарак павінна быць павышанай. Адзін з асноўных напрамкаў работы раённых, сельскіх Саветаў дэпутатаў заключаецца ў тым, каб пераканаць, зацікавіць людзей займацца развіццём сваіх падворкаў. Асабістыя падсобныя гаспадаркі — гэта векавыя традыцыі беларускага народа. Калі чалавек звярнуўся па дапамогу , то трэба ўсяляк садзейнічаць яму ў забеспячэнні кармамі, тэхнікай, прадастаўленнем паслуг».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.03.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8670,00 | ▼ |
| Еўра | 11110,00 | ■ |
| Рас. руб. | 279,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1064,46 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 2° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | 0° |
| Гродна | + 1° |
| Магілёў | 0° |
| Мінск | + 1° |

# ДЛЯ БЕЛАРУСІ ВАЖНЫ БЕРАГ ТУРЭЦКІ

## Абедзвюм краінам неабходна збалансаваць гандаль і нарошчваць супрацоўніцтва

**Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з міністрам замежных спраў Турцыі Ахметам Давутаглу, перадае карэспандэнт БелТА.**

Аляксандр Лукашэнка лічыць ненармальным, што ў Беларусі і Турцыі пры велізарных магчымасцях такія мізэрныя аб'ёмы ўзаемнага гандлю. «Мы вельмі актыўна супрацоўнічаем з краінамі «далёкай дугі». З дзяржавамі, якія размешчаны побач, краінамі былога Савецкага Саюза, Усходняй Еўропы — з імі ў нас па вялікім рахунку праблем няма ні ў гандлі, ні ў палітыцы, але мы вырашылі дыверсіфікавацца і знайсці інтарэсы ў далёкіх краінах», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. У якасці прыкладу ён прывёў свой нядаўні візіт у Паўднёва-Усходнюю Азію. «Па кантрактах у выніку візіту мы наблізіліся да гандлю ў $0,5 млрд. А вось з Турцыяй, з якой знаходзімся побач, мы такога не маем. Згадзіцеся, гэта ненармальна», — лічыць Прэзідэнт.

«З некаторым асадкам і горыччу аб гэтым кажу, таму што ў нас проста выдатныя адносіны ў палітычнай сферы, у нас няма вострых праблем, з якімі б сутыкалася кіраўніцтва Турцыі і Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтаму візіту міністра замежных спраў Турцыі беларускі бок надае сур'ёзнае значэнне. «Гэта не проста традыцыйныя словы, — сказаў беларускі лідар. — Для нас вельмі важны ваш візіт у Мінск. І я вельмі спадзяюся, што ў выніку мы выйдзем на некалькі (пяць-шэсць) напрамкаў супрацоўніцтва, якія могуць значна актывізаваць гандлёва-эканамічныя сувязі і аб'ёмы гандлю, што прывядзе да зрухаў і развіцця ўсіх кірункаў супрацоўніцтва». «Давайце пацвердзім гэта справай», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу міністр замежных спраў Турцыі Ахмет Давутаглу выказаў меркаванне, што Беларусь і Турцыя здольныя павялічыць тавараабарот да некалькіх мільярдаў долараў. Міністр пагадзіўся з кіраўніком беларускай дзяржавы, што патэнцыял эканамічных адносін дзвюх краін не рэалізуецца. «Мы маглі б павялічыць наш тавараазварот у гэтым годзе да $1 млрд, а на працягу двух-трох гадоў — і да некалькіх мільярдаў долараў», — сказаў ён. Ахмет Давутаглу адзначыў, што Беларусь з'яўляецца месцам, дзе турэцкі бізнэс лічыць мэтазгодным ажыццяўляць інвестыцыі. Міністр падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за аказваемую падтрымку.

Ахмет Давутаглу перадаў Аляксандру Лукашэнку найлепшыя пажаданні ад Прэзідэнта Турцыі Абдулаха Гюля. «Усім вядома, што Турцыя з'яўляецца першай дзяржавай, якая прызнала суверэнітэт Беларусі. І ў нашых палітычных адносінах няма ніякіх праблем».

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**2 красавіка 2013 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

# ЗБАЎЧАЕ СВЯТА

## Пастырскае пасланне арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча на Вялікдзень 2013 года

Глыбокапаважаныя святары, браты і сёстры, людзі добрай волі!

«Хрыстус уваскрос!» — «Сапраўды ўваскрос!»

Гэтымі словамі пасхальнага заклiку вiтаю і віншую ўсіх вас з радасным і збаўчым святам Уваскрэсення Езуса Хрыста, святам, якое з'яўляецца падмуркам нашай веры, бо калі б Хрыстус не ўваскрос, то марным было б нашае прапаведванне і марнай была б наша вера (1 Кар. 15, 14), — як заўважае св. апостал Павел. Гэта азначае, што без Уваскрэсення наша вера была б падобнай да пабудаванага на пяску дома, які разбурылі б дажджы і ветры (Мц. 7, 24-27). У той жа час наша вера засноўваецца на Уваскрэсенні Хрыста.

Пацвярджэннем Уваскрэсення Езуса быў як пусты гроб, да якога прыйшлі жанчыны, што прынеслі алей, і апосталы Пётр і Ян, так і прысутнасць сярод апосталаў уваскрослага Хрыста. Яны сустрэлі Яго ў Вячэрніку і па дарозе ў Эмаус і таксама пазналі Яго падчас супольнага пасілкоўвання каля Галілейскага возера. Святы Тамаш дакрануўся да Яго ран. Ён аб'явіўся больш чым пяцістам чалавек.

Гэта былі рэальныя сустрэчы, якія адбыліся ў рэальны час і ў рэальных месцах. Яны былі апісаны сведкамі, многія з якіх пацвердзілі іх праўдзівасць пакутніцкай смерцю.

Падзея, якая адбылася дваццаць стагоддзяў таму, працягваецца і дакранаецца да кожнага з нас у сакрамэнце хросту, у якім мы паміраем для граху і ўваскрасаем да жыцця ў Божай ласцы. У ім мы акунаемся ва Уваскрэсенне Хрыста, які адкрывае нам доступ да новага жыцця (Рым. 6. 3-4. 11-14). Без гэтага ўваходжання ў таямніцу цярпенняў, смерці і Уваскрэсення Езуса мы б глядзелі на таямніцу Пасхі, як турыст глядзіць на горад праз акно аўтобуса. Гэтым самым не дазволілі б пасхальнай падзеі ахапіць усе вымярэнні нашага жыцця і ўвайсці ў яго. У той жа час дзякуючы пасхальнай таямніцы мы становімся дзецьмі Божымі, і апошняе слова адносна нашага лёсу належыць не да смерці, але да жыцця. Уваскрэсенне Хрыста змяніла прыроду чалавека і свету, у якім прысутнічае Збаўца. Мы можам Яму давяраць і ў Ім мець надзею, бо Ён не належыць да мінулага, але ёсць сучаснасцю і вядзе ў будучыню. Прыгожа аб гэтым нагадвае святы айцец Бенедыкт XVI, які заклікае да жыцця надзеяй, у якой мы збаўлены (SS 1).


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Уваскрэсенне Хрыста ёсць пераход да жыцця ў новым вечным вымярэнні. У гэтым таіцца перамога Пасхі як наша збаўленне! Таму разам са св. Аўгустынам можам казаць, што Уваскрэсенне Хрыста — наша надзея, бо ўводзіць нас у новую будучыню.

Такім чынам праўда аб Уваскрэсенні Хрыста адкрывае перад чалавекам новую перспектыву яго жыцця, у якое ўваходзіць подых вечнасці. Таму апошнім вымярэннем жыцця чалавека з'яўляецца не тленнасць, але вечнасць. Святы апостал Павел кажа: «Калі ж вы ўваскрэслі з Хрыстом, шукайце таго, што ў вышынях, дзе Хрыстус сядзіць праваруч Бога» (Кал. 3, 1). Як вучні Хрыста, мы павінны быць сведкамі гэтага заклiку з мэтай паказваць значэнне Уваскрэсення Хрыста ўсім людзям, каб свет паверыў. СТАР. 3




# У 2014 ГОДЗЕ Ў НАС ПРОЙДЗЕ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ. ПА РЫБАЛЦЫ

**Старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Шумскі падчас анлайн-відэабрыфінгу распавёў пра вынікі працы падначаленага яму ведамства, сябрамі якога з'яўляюцца больш за 70 тысяч беларусаў. Напрыклад, дзякуючы намаганням таварыства, чэмпіянат свету па рыбалцы на мармышку ў 2014 годзе пройдзе на адным з вяслярных каналаў нашай краіны.**

Ёсць поспехі і ў развіцці паляўнічага турызму: у Беларусь на паляванне прыязджаюць грамадзяне іншых краін, пераважна расіяне. Пры гэтым Юрый Шумскі заўважыў: «Нашых, беларускіх паляўнічых мы не крыўдзім. Пераважная большасць гаспадарак — агульнадаступная для ўсіх грамадзян, у першую чаргу — для сяброў нашага таварыства». Летась 30 працэнтаў капытных жывёл было здабыта замежнікамі, астатнія 70 працэнтаў — айчыннымі аматарамі палявання. Існуюць і некаторыя праблемы ў сферы паляўнічага турызму, напрыклад, слабая інфраструктура. У размяшчэнні і харчаванні кліентаў таварыству дапамагаюць прыватныя аграсядзібы, якія таксама маюць з турыстаў вялікі прыбытак.

Асобна закранапася пытанне палявання з сабакамі. Зараз беларускія паляўнічыя шырока карыстаюцца беспароднымі, паходжанне якіх невядома. Пакуль ніякіх захадаў у гэтым кірунку прымацца не будзе, аднак ужо праз 2-3 гады плануецца забараніць рэгістрацыю паляўнічымі такіх жывёл і перайсці на выкарыстанне толькі сабак з вядомай радаслоўнай.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЗС РАСІІ АБУРАНЫ ТЭЗІСАМ АБ ТОЕСНАСЦІ НАЦЫЗМУ І КАМУНІЗМУ

Тэзіс аб тоеснасці нацызму і камунізму, які прагучаў падчас праведзеных у Еўрапарламенце слуханняў, МЗС Расіі расцэньвае як «спробу фальсіфікацыі гісторыі, адкрыты цынізм і блюзнерства ў дачыненні да тых, хто вызваліў свет ад жахаў карычневай чумы». Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС РФ Аляксандр Лукашэвіч. «Падобныя захады абражаюць памяць мільёнаў ахвяр злачынстваў супраць чалавечнасці, якія былі асуджаны Нюрнбергскім трыбуналам», — дадаў ён. Ён параіў бы членам Еўрапарламента ад краін Балтыі звярнуць увагу на «абуральныя факты гераізацыі гітлераўскіх злачынцаў і іх мясцовых калабарацыяністаў», сведчаннямі якіх служаць штогадовыя шэсці ў Латвіі і злёты ў Эстоніі былых легіянераў «Вафен-СС» і іх цяперашніх паслугачоў, адкрыццё ў верасні 2012-га помніка эсэсаўцам у Баўске.




### ПРЭЗІДЭНТ КІПРА АБВІНАВАЦІЎ ЕС У «ЭКСПЕРЫМЕНЦЕ» НАД КРАІНАЙ

Сітуацыя на Кіпры, дзе ўсяго суткі таму зноў адчыніліся банкі, знаходзіцца пад кантролем. Пра гэта заявіў у пятніцу прэзідэнт рэспублікі Нікас Анастасіядзіс, перадае Reuters. Ён удакладніў, што ўтрымаць кантроль атрымалася дзякуючы дамове, дасягнутай уладамі Кіпра і тройкай міжнародных крэдытораў. Як вядома, яна прадугледжвае рэструктурызацыю вядучых банкаў краіны і ўвядзенне надзвычайнага падатку на буйныя ўклады, якія перавышаюць 100 тысяч еўра. Разам з тым прэзідэнт Кіпра раскрытыкаваў пазіцыю партнёраў па еўразоне, абвінаваціўшы іх у вылучэнні «беспрэцэдэнтных патрабаванняў», якія фактычна ператвараюць краіну ў паддоследнага труса. «На Кіпры ставіцца эксперымент», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым, аднак, ён заявіў, што краіна не мае намеру адмаўляцца ад еўра. «Мы не будзем эксперыментаваць з будучыняй нашай краіны», — сказаў Анастасіядзіс.

### ПРЭЗІДЭНТ ФРАНЦЫІ ПРАПАНАВАЎ АБКЛАСЦІ 75-ПРАЦЭНТНЫМ ПАДАТКАМ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

Прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд не губляе надзеі стрымаць свае перадвыбарныя абяцанні і паправіць фінансавыя справы краіны за кошт заможных грамадзян. Выступаючы на тэлеканале France 2, кіраўнік дзяржавы зноў вярнуўся да пытання аб увядзенні 75-працэнтнага падатку для багатых, які раней ужо быў прызнаны неканстытуцыйным. На гэты раз Аланд плануе спаганяць гэты падатак не з асобных грамадзян, а з прадпрыемстваў. Мяркуецца, што яны будуць аднімаць яго з заробкаў, якія пераўзыходзяць 1 млн еўра за год. Канфіскацыйны падатак для багатых стаў адным з абяцанняў, з якімі Аланд прыйшоў да ўлады. Яго ўвядзенне павінна было стаць адным з захадаў па барацьбе з эканамічным крызісам, які дапаможа сабраць у казну за год 20 млрд еўра.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АЛІЎКАВЫ АЛЕЙ АБАРАНЯЕ МОЗГ

**Аліўкавы алей працягвае здзіўляць медыкаў. На гэты раз было даказана, што ён зніжае рызыку хваробы Альцгеймера, піша Digital Journal. Даследаванне праводзіў Універсітэт Луізіяны.**

Эксперты ўстанавілі: хвароба менш распаўсюджана ў краінах Міжземнамор'я. А вядома, што ў рацыёне мясцовых жыхароў можна знайсці ў вялікіх колькасцях аліўкавы алей «экстра вірджын», багаты на мананенасычаныя тлушчы. Дэталёвае даследаванне паказала, што ў алеі прысутнічае фенольнае супрацьзапаленчае злучэнне — олеакантал. У якасці асноўнай прычыны развіцця хваробы Альцгеймера традыцыйна называецца назапашванне бэта-амілоіднага бялку. Олеакантал, у сваю чаргу, дазваляе актывізаваць выпрацоўку двух пратэінаў і ключавых энзімаў, якія выдаляюць бэта-амілоідны бялок з мозгу.



## НАДВОР'Е

### САМЫ ХАЛОДНЫ САКАВІК ЗА АПОШНІЯ 50 ГАДОЎ

**Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў атмасферных франтоў і больш цёплых паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы.**

Таму ўначы паўсюдна будзе ісці снег, а ўдзень ападкі чакаюцца ўжо ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы чакаецца моцны парывісты вецер. Мінімальная тэмпература паветра ўначы 0 — мінус 6, па паўночным усходзе да 7—10 марозу, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

У нядзелю ў нас пачне гаспадарыць паўднёвы цыклон. Уначы месцамі пройдзе кароткачасовы снег, а ўдзень па паўднёвай палове краіны чакаецца мокры снег і дождж. У асобных раёнах туман і галалёд. Уначы будзе ўжо ад 0 да мінус 6, пры праясненнях да 10 марозу. Максімальная тэмпература ўдзень — ад 0 да плюс 5 градусаў.

**У панядзелак у Беларусі прагназуюцца ўвогуле складаныя ўмовы надвор'я.** Амаль паўсюдна будзе ісці снег, мокры снег, месцамі снег моцны, наліпанне мокрага снегу і мяцеліца. Па паўднёвым усходзе будзе ісці мокры снег і дождж, дзе потым чакаецца туман і галалёд. Уначы прагназуецца ад 0 да 5 марозу, удзень — ад мінус 2 да плюс 4; па паўднёвым усходзе ўначы нават 1—3 цяпла, а ўдзень — плюс 5—7, а месцамі нават да 10 цяпла.

Сіноптыкі адзначаюць, што сярэднясутачная тэмпература паветра за мінулы тыдзень была на 5—10 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Увогуле сакавік стаў на 2—4 градусы халаднейшы, чым звычайна. За гэты час у асобных раёнах па паўднёвым усходзе выпала ажно 2—4 месячныя нормы ападкаў. Такога халоднага вясновага надвор'я ў Беларусі не было ўжо 50 гадоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЛЕПШЫЯ ЎМОВЫ ПРАЖЫВАННЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ І ІНВАЛІДАЎ ВЫЯВІЎ КОНКУРС

**Учора адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.**

На калегіі былі разгледжаны два пытанні: ход рэалізацыі ў 2012 годзе Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Беларусі на 2011-2015 гады і выкананне ў 2012 годзе мерапрыемстваў Рэспубліканскай мэтавай праграмы па паляпшэнні ўмоў і аховы працы на 2011-2015 гады.

Акрамя таго, адбылося ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага агляду дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў і для дзяцей-інвалідаў на лепшую пастаноўку работы па абслугоўванні, забеспячэнні здаровых і бяспечных умоў пражывання пенсіянераў і інвалідаў і аховы працы работнікаў па выніках работы за мінулы год.

Першае месца сярод дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў заняў Капаткевіцкі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў Гомельскай вобласці (дырэктар Коўшун І.П).

Сярод псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў першае месца аказалася ў Лідскага дома-інтэрната для псіханеўралагічных хворых Гродзенскай вобласці (дырэктар Стацэвіч Я.А.)

І сярод дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця першае месца прысвоена Веснаўскаму дому-інтэрнату для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Магілёўскай вобласці (дырэктар Клімовіч В.В.).

**Святлана БУСЬКО.**

# Ад чаго лечаць у ЛПП?

**У ніжнюю палату парламента паступілі прапановы ад спецыяльнай міжведамаснай працоўнай групы, створанай Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая вывучала пытанні ўдасканалення дзейнасці лячэбна-працоўных прафілакторыяў.**

Прапановы гэтыя датычацца заканадаўчага замацавання трох момантаў: вызначэнне парадку і ўмоў накіравання ў ЛПП абавязаных асоб; накіраванне ў ЛПП замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі; магчымасць скарачэння тэрміну знаходжання ў ЛПП.

— Справа ў тым, што парадак і ўмовы накіравання абавязаных асоб (гэта значыць, тых, хто абавязаны кампенсаваць выдаткі дзяржавы на ўтрыманне ўласных дзяцей) не былі прапісаны ў законе; выпала з апошняй рэдакцыі і катэгорыя замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, а такіх нямала, — патлумачыў **«Звяздзе» Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.** — Што тычыцца скарачэння тэрмінаў, то першапачаткова такая норма была, але прымянялася яна не да тых, хто хутчэй вылечыўся, а зусім наадварот — да тых, хто стварае дадатковыя клопаты для адміністрацыі ЛПП. Аднак не сакрэт, што ў большасці выпадкаў у лячэбна-працоўныя прафілакторыі накіроўваюць не столькі каб вылечыць чалавека ад залежнасці, колькі каб даць сям'і магчымасць ад яго «адпачыць», бо жыць з такім сваяком невыносна. Вось і атрымліваецца: сям'я з цяжкасцю адправіць родзіча ў ЛПП (а гэта вельмі няпростая працэдура), а той праз паўгода вяртаецца і зноў не дае нікому жыцця.

Таму гэтую норму спачатку прыбралі, кажа дэпутат, а зараз яе ініцыююць у крыху іншым выглядзе: калі чалавек першы раз трапіў у ЛПП, то павінен адбыць там не менш за дзве трэці тэрміну, а калі ў другі раз — не менш за тры чвэрці (тэрмін знаходжання ў ЛПП, як правіла, 1,5-2 гады). «Пытанне досыць спрэчнае, — лічыць дэпутат, — бо нормы вызвалення звязаныя з тым, наколькі добра чалавек працуе, а не з тым, наколькі ён вылечыўся. Дзяржава выдаткоўвае вялікія сродкі на лячэнне, аднак ніхто не вядзе статыстыку, колькі з тых, хто выйшаў з ЛПП, вярнуліся да нармальнага жыцця. У нас ніхто не ведае вынікаў існавання гэтых установаў, і нават няма разумення, хто павінен гэтыя вынікі адсочваць: ахова здароўя, міліцыя або мясцовыя ўлады. Ёсць людзі, якія трапляюць у ЛПП другі і трэці раз, і нічога не мяняецца ў іх жыцці да лепшага. Які ж тады сэнс?»

Парламенцкая камісія разам з прадстаўнікамі ўсіх зацікаўленых бакоў разглядае прапановы спецыяльнай міжведамаснай групы для ўключэння іх у новы законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх». Потым прапановы пройдуць парадак узгадненняў і зноў вернуцца ў парламент, пасля чаго законапраект будзе вынесены на сесію. Таму пакуль цяжка казаць, які праект закона атрымаецца на выхадзе. Гэта тычыцца і іншых новаўвядзенняў.

Галоўным недахопам работы ЛПП Валерый Гайдукевіч лічыць тое, што ніхто не бярэ на сябе асноўную адказнасць за дзейнасць гэтай сістэмы. Памылкова лічыць, што гэта справа МУС, кажа дэпутат, бо міліцыя толькі дапамагае, аднак асноўную работу павінны праводзіць мясцовыя ўлады — уладкоўваць на працу, кантраляваць, арганізоўваць псіхалагічную, сацыяльную і медыцынскую дапамогу.

На пытанне журналістаў, ці не лепей за ўтрыманне ЛПП абмежаванне продажу таннага алкаголю ў крокавай даступнасці, парламентарый адказаў: «Падобныя абмежаванні раней прымаліся, і не раз, аднак яны альбо ўпіраліся ў супраціўленне мясцовых улад, альбо выклікалі незадавальненне насельніцтва і масавыя атручванні самаробнымі альбо падробленымі алкагольнымі напоямі. Змагацца з алкагалізацыяй насельніцтва трэба комплексна, забаронныя захады тут неэфектыўныя. Трэба ўводзіць моду на здаровы лад жыцця, весці размову пра культуру спажывання спіртных напояў, праводзіць адпаведную работу яшчэ з дзецьмі ў школах».

Пакуль жа пытанне ліквідацыі ЛПП дачаснае, лічыць дэпутат, больш за тое, у некаторых краінах СНД задумваюцца пра вяртанне да падобных установаў. Сёння з усіх постсавецкіх краін ЛПП працягваюць працаваць толькі ў Беларусі і Туркменіі. Прымусовая ізаляцыя з наступнай рэабілітацыяй па рашэнні суда існуе таксама і ў некаторых заходнееўрапейскіх краінах, напрыклад, у Германіі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Паводка

## ТАКАЯ НАША ГАРЫНЬ!

**У Брэсцкім абласным упраўленні МНС паведамілі, што ў Столінскім раёне падтоплена каля трох дзясяткаў падворкаў у населеных пунктах па беразе Гарыні. Аднак спецыялісты адзначаюць: за апошнія двое сутак узровень вады ў рацэ паступова зніжаецца. Калі гідрапост Віктаровічы 27 сакавіка зафіксаваў узровень у 530 сантыметраў, то ранкам 29 сакавіка было ўжо 512 сантыметраў.**

Паводку найбольш адчулі на сабе жыхары Манькавіцкага і Харомскага сельсаветаў. Вось што расказаў карэспандэнту «Звязды» старшыня Харомскага сельвыканкама Анатоль СКРАБЕЦ:

— Літаральна некалькі хвілін таму прыехалі з супрацоўнікамі райаддзела МНС з рэйда па населеных пунктах. Абстаноўка звычайная для нашых мясцін. У Харомску падтоплена 13 падворкаў, па пяць-шэсць — у іншых вёсках. Галоўнае, што ў дамах вады няма. А вось хлявы... Жывёлу загадзя вяскоўцы пераправілі да сваякоў, суседзяў. Ні ў аднаго гаспадара карова ці свіння па калена ў вадзе не стаіць. Перасяліліся на ўсялякі выпадак дзве сям'і: маладыя гаспадары з дзецьмі падаліся да сваіх бацькоў, і адна пажылая пенсіянерка пераехала да дачкі.

Гэта звычайная з'ява ў такую пару. Такая ўжо наша Гарынь! Ніводнай вясны не было, каб яна хоць крышку не паказала свой нораў. Таму людзі гатовыя да паводкі, тактыка паводзін выпрацавана ў нас гадамі, а то і вякамі, дзяды і прадзеды таксама ўмелі ратавацца ад вялікай вады. Цяпер, праўда, надта многа снегу. Нават старажылы не памятаюць такога снежнага сакавіка. На рацэ ў нашай мясцовасці быў ледаход, а потым яна зноў пакрылася лёдам. З-за гэтага могуць быць усялякія сюрпрызы. Абнадзейвае толькі, што ўзровень вады пайшоў уніз. Можа, прырода ўсё ж пашкадуе нас, начныя мінусавыя тэмпературы запаволяць працэсы, і вада паступова сыдзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Гэта мы, Госпадзі...

## БАЦЬКА ЎДАРЫЎ НАЖОМ СЫНА

**Удзень у аператыўна-дзяжурную часць Партызанскага РУУС г. Мінска паступіла паведамленне, што ў кватэры па вуліцы Уральскай 10-гадоваму хлопчыку нанесена нажавое раненне. На месцы высветлілася, што зрабіў гэта... бацька дзіцяці.**

— Па першых даных, школьнік знаходзіўся дома разам з татам, маці ў гэты час была на працы. У нейкі момант бацька падышоў да сына і нечакана ўдарыў яго ў жывот кухонным нажом. Пасля гэтага пакінуў кватэру, — паведаміла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС сталіцы Ганна Чыж-Літаш. — Хлопчык, быўшы ў прытомнасці, нягледзячы на моцны крывацёк, патэлефанаваў маці. Тая хутка прыехала дадому, выклікала «хуткую дапамогу», якая і даставіла пацярпелага ў бальніцу ў вельмі цяжкім стане.

На пошукі бацькі былі кінуты ўсе сілы раённага ўпраўлення міліцыі, інфармацыя пра яго прыкметы была перададзена ўсім нарадам, якія неслі службу ў горадзе. У выніку праз гадзіну мужчыну знайшлі ў адным з суседніх жылых кварталаў. Свой учынак 35-гадовы рабочы ЖЭСа міліцыянерам ніяк патлумачыць не змог. На ўліках у псіханеўралагічным і наркалагічным дыспансэрах ён не стаяў. Заведзена крымінальная справа. Расследаванне праводзяць супрацоўнікі Следчага камітэта краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Фестываль моў. Цяпер і ў Мінску...

**Першы Мінскі фестываль моў пройдзе 31 сакавіка на філалагічным факультэце БДУ. Гэта, без перабольшання, унікальная не толькі для беларускай сталіцы акцыя.**

Першы ў свеце фестываль моў быў праведзены ў 1995 годзе ў Францыі ў горадзе Тур і сабраў 800 гасцей. Яго арганізаваў амерыканскі лінгвіст і эсперантыст Дэні Кіф. Ужо ў наступным годзе ў Чабаксарах прайшоў першы расійскі фестываль моў. Затым аналагічныя мерапрыемствы адбыліся ў ЗША, Венесуэле, Кітаі, Бельгіі, Швецыі, Малдове, Украіне і іншых краінах. У многіх гарадах свету правядзенне фестываляў моў ужо паспела стаць штогадовай традыцыяй. Дарэчы, у 2008 годзе Дэніс Кіф арганізаваў першы фестываль моў у Кітаі (г. Нанкін), дзе было прадстаўлена больш як 70 моў і дыялектаў, а ўдзельнікамі свята сталі 13500 чалавек. Гэты фестываль лічыцца найбуйнейшым у свеце.

У Мінску за адзін дзень гасцям будзе прадстаўлена больш як тры дзясяткі моў свету: як сучасных і папулярных, так і малавядомых і тых, што выйшлі з ужытку.

У праграму фестывалю ўключаны навукова-папулярныя лінгвістычныя лекцыі і сустрэчы з носьбітамі розных моў. Але галоўнай «разынкай» стануць прэзентацыі — захапляльныя 40-хвілінныя міні-лекцыі па гісторыі развіцця канкрэтнай мовы, яе станаўленні і сучасным стане. Чытаць іх будуць студэнты, аспіранты і выкладчыкі філалагічнага і факультэта міжнародных адносін БДУ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а таксама лінгвісты і мовазнаўцы з Масквы, Санкт-Пецярбургу і Кіева.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Сезон адкрыты

# ГУКАЕМ ФУТБОЛ

### Сёння ў трох гарадах Беларусі распачынаецца чарговы, 23-ці па ліку чэмпіянат краіны па футболе

**Надвор'е — капрызлівая штука, яго здаўна імкнуцца прадказаць метэаролагі. І далёка не заўсёды ў гідраметцэнтрах прыходзяць да адназначных адказаў на прыродныя пытанні. У сваю чаргу Беларусь наогул вызначаецца нейкім татальна непаслядоўным кліматам. Узнікае адчуванне, што ў нас часам вясна мяняецца месцамі з зімой, а лета з восенню. І тое, што зараз адбываецца на нашых вуліцах, наогул не паддаецца ніякаму рацыянальнаму тлумачэнню. «Хаўер» наламаў столькі дроў, што разбіраць ягоныя наступствы давядзецца яшчэ ў сярэдзіне красавіка.**

### Першы тур чэмпіянату Беларусі па футболе сярод камандаў вышэйшай лігі

**30 сакавіка**

**«Мінск» — «Тарпеда» (Жодзіна) (Мінск; 15.00, штучнае поле ФК «Мінск»)**

**«Белшына» (Бабруйск) — Дынама» (Брэст) (Мінск; 17.30, штучнае поле ФК «Мінск»)**

**«Нафтан» (Наваполацк) — «Шахцёр» (Салігорск) (Наваполацк; 16.00, штучнае поле стадыёна «Атлант»)**

**«Дняпро» (Магілёў) — «Гомель» (Магілёў; 17.00, стадыён «Спартак»)**

**31 сакавіка**

**«Нёман» (Гродна) — «Славія» (Мазыр) (Гродна; 14.00, стадыён «Нёман»)**

**БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Мінск) (Жодзіна; 17.00, стадыён «Тарпеда»)**

І вось у такіх умовах стартуе чэмпіянат Беларусі па футболе сярод камандаў вышэйшай лігі. Шкада, але так атрымалася, што большасць стадыёнаў да старту амаль не падрыхтаваны. ФК «Мінск» свой першы матч з жодзінскім «Тарпеда» будзе гуляць на штучным полі з падагрэвам, на гэтым полі «Белшына» будзе супрацьстаяць брэсцкаму «Дынама», «Нафтан» таксама на сінтэтычным пакрыцці сустрэнецца з «Шахцёрам». А вось галоўны матч тура паміж БАТЭ і мінскім «Дынама» правядуць у Жодзіне, дзе зараз, напэўна, як і ў Гродне, найлепш падрыхтаваныя арэны ў рэспубліцы. І абумоўлена гэта не проста гераічнай працай жодзінцаў, якія рыхтавалі поле для чужых клубаў, а ў якасным падагрэве. Праца гэтага абсталявання каштуе дзясяткі тысяч долараў, а таму і не дзіўна, чаму клубы адмаўляюцца гуляць першы матч чэмпіянату ў сябе дома. Па-першае, падагрэў поля ёсць не на ўсіх стадыёнах, па-другое, патрабуе вялікіх выдаткаў, і, па-трэцяе, навошта рыхтаваць, а пасля псаваць свой газон, калі можна арандаваць «сінтэтыку» і згуляць першыя матчы менавіта там. Здаецца, што такой логікай кіраваліся кіраўнікі пэўных клубаў. Аднак усё пералічанае — пытанне не толькі да футбольных калектываў, аднак і федэрацыі. Ну сапраўды, навошта пачынаць першынство так рана, калі ўжо даўно вядома, што сакавік і пачатак красавіка ў нас традыцыйна не вызначаецца адэкватным для правядзення матчаў надвор'ем. І гэта пры тым, што ў чэмпіянаце ўсяго толькі 12 клубаў? Для «птушачкі»? Ну а калі так, дык беларускі балельшчык, на жаль, яшчэ доўга не пабачыць якасны вясенні футбол.

У адрозненне ад стадыёнаў, асноўныя прэтэндэнты на ўзнагароды падрыхтаваліся да новай чэмпіёнскай гонкі добра, маюць у складах не проста моцных, а сапраўды зорных футбалістаў. Мінскае «Дынама», каманда Алега Пратасава, працягвае здзіўляць грамадскасць імёнамі новых гульцоў, вядомымі на ўвесь СНД. Пра нечаканыя пераходы ў стан «блакітна-белых» Дзмітрыя Сычова і Аляксандра Гутара мы ўжо пісалі. Даволі вядомым навічком дынамаўцаў стаў 28-гадовы нігерыец Крысціян Абода, які калісьці паспеў пагуляць у Італіі за «Перуджу», «Фіярэнціну», «Удзінэзэ», «Тарына» і «Лечэ». І сапраўды, гэта футбаліст з выдатнай біяграфіяй, якога мы на сваіх палях яшчэ не бачылі. Самае цікавае, што «Дынама» магло падпісаць яшчэ аднаго, між іншым, цудоўнага гульца, які паспеў калісьці і за мадрыдскі «Рэал» згуляць. Аднак ва ўругвайца Пабла Гарсія рэзка змяніліся планы, і ён вокамгненна перагледзеў сваё рашэнне ляцець у Мінск. Толькі і без яго ў «Дынама» склад добры, гарманічны, а таму ў чарговы раз захаваць БАТЭ чэмпіёнства будзе вельмі няпроста. А вось што тычыцца клуба Анатоля Капскага, дык барысаўчане падпісалі канкракт толькі з адным легіянерам, латвійскім галкіперам Германам Маліньшам. Усе астатнія навічкі — толькі беларусы. Сярод іх адзначым вяртанне на радзіму Паўла Няхайчыка **(на фота справа)**. За два гады ў маскоўскім «Дынама» ён так і не здолеў стаць стабільным гульцом асноўнай каманды. А таму яго вяртанне ў родную каманду бачыцца даволі правільным і адэкватным рашэннем.

Паралельна з «камбэкам» Няхайчыка стала вядома, што ў Беларусь прыехаў Анры Хагуш, адзін з футбалістаў той славутай барысаўскай каманды, якая ўпершыню прабілася ў групавую стадыю Лігі чэмпіёнаў. Толькі цяпер Анры гуляць будзе не за БАТЭ, а ў жодзінскім «Тарпеда». Сярод іншых трансфераў міжсезоння адзначым пераезд групы футбалістаў «Гомеля» ў салігорскі «Шахцёр», а таксама пераход з рыжскага «Сконта» ў брэсцкае «Дынама» Міноры Сата, другога ў гісторыі айчыннага футбола японскага легіянера. Ужо зараз відаць, што, зыходзячы і з фінансавання, і падбору выканаўцаў, прэтэндэнтамі на ўзнагароды з'яўляюцца БАТЭ, мінскае «Дынама» і салігорскі «Шахцёр». Астатнія каманды перад чэмпіянатам прыкладна больш-менш роўныя, а таму прадказаць склад той выніковай шасцёркі, якая павядзе барацьбу за медалі, вельмі складана. Сёлетні турнір сапраўды абяцае быць багатым на захапляльныя паядынкі. Толькі шкада, што з-за вельмі цікавага календара пэўным камандам даводзіцца пачынаць не на сваіх стадыёнах, не на вачах родных балельшчыкаў, а на нейтральнай тэрыторыі. Спадзяёмся, першы і апошні раз.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара**



## Можна здаць «арсенал»

**З 1 па 5 красавіка ў краіне будуць праводзіцца аператыўна-прафілактычныя спецыяльныя комплексныя мерапрыемствы «Арсенал» па добраахвотнай здачы зброі і боепрыпасаў.**

Як адзначае старшы інспектар па дазвольнай працы аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска Юрый СІЛІВОНЧЫК, пры добраахвотнай здачы зброі і боепрыпасаў у органы ўнутраных спраў чалавек вызваляецца ад адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці. Для здачы можна звяртацца ў аддзяленне міліцыі па месцы жыхарства. На тэрыторыі Першамайскага раёна сталіцы — па вуліцы Бялінскага, 10. Тэл. 280 97 31, 280 02 02, 102.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Падазраецца ў злоўжыванні

**Распачата крымінальная справа ў дачыненні да першага намесніка старшыні — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гарадоцкага райвыканкама.**

Як паведамілі ў КДК Віцебскай вобласці, ён падазраецца ва ўчыненні крадзяжу шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, здзейсненым у буйным памеры. Пра гэта стала вядома па выніках праверкі дзейнасці шэрагу камунальных унітарных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гарадоцкага раёна, якую ажыццявілі супрацоўнікі КДК Віцебскай вобласці і Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. Быў выяўлены факт незаконнага водпуску па ўказанні вышэйшай службовай асобы прадстаўніку камерцыйнай фірмы з Магілёўскай вобласці дырэктарам сельскагаспадарчага прадпрыемства імя Свярдлова Гарадоцкага раёна без аплаты і афармлення адпаведных дакументаў насення траў на суму каля 20 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Культурная сталіца

# ГРАН-ПРЫ — У «ГАМЛЕТА»

**Лепшым спектаклем на VIII міжнародным моладзевым тэатральным форуме «М.@rt.кантакт» названы «Гамлет» Магілёўскага абласнога тэатра лялек.**


Фота БЕЛТА.

Магілёў на цэлы тыдзень захапіў тэатр. На форуме журы і публіцы прадставілі 14 пастановак разнастайных тэм і жанраў. Акрамя гэтага, былі абмеркаванні і спрэчкі ў тэатральнай кавярні, чыткі п'ес у майстэрні маладой рэжысуры і нават фестывальны начны клуб.

У Міжнародны дзень тэатра, 27 сакавіка, журы падвяло вынікі. Галоўны прыз форуму застаўся ў Магілёве. Гэты «Гамлет» быў упершыню пастаўлены на сцэне лялечнага тэатра ў Беларусі. Праўда, у прачытанні Магілёўскага тэатра лялек вядомая трагедыя Шэкспіра стала «трагіфаршам». Гэта эксперыментальная пастаноўка, сучаснае бачанне класікі. Рэжысёр Ігар Казакоў спрабаваў разам з акцёрамі «вывучыць і асэнсаваць шэкспіраўскую трагедыю, у якой пытанняў значна болей, чым адказаў».

Крытыкі адзначылі фантанаванне рэжысёрскіх задумак, магутны арсенал выяўленчых сродкаў, іронію і драматызм «у адным флаконе». Карацей — ніякай звыклай руціны.

— Гэтая пастаноўка перасягнула межы лялечнага тэатра, — сказаў удзельнік журы, старшыня Асацыяцыі рэжысёраў Літвы Саўліс Варнас.

Таму нездарма магілёўскага «Гамлета» ўжо запрасілі на некалькі тэатральных фестываляў. Арганізатары «М.@rt.кантакту» сёлета ўпершыню ўключылі ў праграму спектаклі лялечных тэатраў, каб разбурыць стары глядацкі стэрэатып пра іх дзіцячую скіраванасць, і гэта ўдалося.

Лепшай маладой актрысай стала Кацярына Зорына — за ролю ў лірычнай драме «Варшаўская мелодыя», якую паказаў на форуме Пецярбургскі тэатр «Прытулак камедыянта». Лепшым маладым акцёрам названы Анатоль Бараннік, які сыграў у пастаноўцы па Сэлінджэры Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы.

За арыгінальную сцэнічную мову адзначана паэтычная драма «Палёт над горадам» Ерэванскага дзяржаўнага тэатра лялек, а самай вартай рэжысёрскай працай аб'яўлена пастаноўка «Рамэа і Джульеты» Санкт-Пецярбургскага тэатра «На Ліцейным», якой кіравала рэжысёр Галіна Жданава.

Спецыяльным дыпломам за яркі дэбют адзначана работа маладой актрысы Кацярыны Ергулевіч, якая выконвае ролю імператрыцы ў пастаноўцы «Шут Балакіраў, альбо Прыдворная камедыя» Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Дарэчы, сёлета ўпершыню сцэнічнай пляцоўкай форуму стала Савецкая плошча ў цэнтры Магілёва. Спектакль пад адкрытым небам прадставіў польскі тэатр «Бюро падарожжаў». Многія так і не адважыліся выйсці ў гэты дзень на вуліцу ў мароз і мяцеліцу. Аднак суровае надвор'е не перашкодзіла артыстам іграць, прычым у вельмі лёгкім адзенні. «Перад палякамі трэба проста зняць капялюш!» — вырашылі ў Магілёве.

На «М.@rt.кантакце» ў наступным годзе будуць іншыя навацыі. Ёсць ужо розныя прапановы: абмежаваць узрост удзельнікаў, запрасіць на майстар-класы маладых крытыкаў, стварыць моладзевае журы. Але галоўнае, напэўна, не зменіцца — аншлагі на спектаклях міжнароднага тэатральнага форуму.

**Ілона ІВАНОВА**


## ОАО «Белсчёттехника»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

млн руб.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2012 года | На 31 декабря 2011 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 124 351 | 41 444 |
| Нематериальные активы | 120 | 7 | 10 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 21 236 | 2 025 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 2 821 | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **148 415** | **43 479** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2 988 | 3 077 |
| В том числе: материалы | 211 | 2 111 | 1 527 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | 877 | 596 |
| товары отгруженные | 215 | | 954 |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 18 410 | 237 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 111 | 49 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 8 724 | 1 314 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 700 | 50 009 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 416 | 2 178 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **33 349** | **56 864** |
| **БАЛАНС** | **300** | **181 764** | **100 343** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **Код строки** | **На 31 декабря 2012 года** | **На 31 декабря 2011 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 86 695 | 68 560 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 8 | 7 |
| Добавочный капитал | 450 | 50 978 | 19 914 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 8 690 | 7 744 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **146 371** | **96 225** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 32 534 | 1 185 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **32 534** | **1 185** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 2 843 | 2 933 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 9 | 768 |
| по авансам полученным | 632 | 439 | 362 |
| по налогам и сборам | 633 | (33) | 799 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 334 | 163 |
| по оплате труда | 635 | 928 | 500 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 6 | 21 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 160 | 320 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 16 | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **2 859** | **2 933** |
| **БАЛАНС** | **700** | **181 764** | **100 343** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2012 года

млн руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2012 года | За январь–декабрь 2011 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 38 601 | 10 508 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (26 618) | (10 408) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 11 983 | 100 |
| Управленческие расходы | 040 | (4 562) | (137) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 7 421 | (37) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 72 | 7 676 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (850) | (3 291) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 6 643 | 4 348 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 3 324 | 537 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 908 | 31 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 635 | 288 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 1 781 | 218 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (1 187) | (739) |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (744) | (33) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (443) | (706) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 991 | 574 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 613 | 72 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 378 | 502 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (9 087) | (693) |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | (915) | (19) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (5 582) | (155) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (2 590) | (519) |
| Иные доходы и расходы | 140 | 59 | (345) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 150 | (5 900) | (666) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | 160 | 743 | 3 682 |
| Налог на прибыль | 170 | (1) | (864) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (5) | (368) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200) | 210 | 737 | 2 450 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 16 520 | 2 689 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | 5 791 | (452) |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 23 048 | 4 687 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

Руководитель В.Ф. Хацкевич

Главный бухгалтер И.А. Гиль УНП 100064838

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование:
**открытое акционерное общество**
**«Барановичский комбинат хлебопродуктов»**
Адрес: 225406, г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21.
Тел./факс 42 33 97, УНП 200166738

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

млн руб.

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 375986 | 551846 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 143733 | 275628 |
| **БАЛАНС** | **300** | **519719** | **827474** |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 316159 | 462792 |
| в т.ч. уставный фонд | 410 | 23736 | 25953 |
| 4. Долгосрочные обязательства | 590 | 131353 | 213771 |
| 5. Краткосрочные обязательства | 690 | 72207 | 150911 |
| **БАЛАНС** | **700** | **519719** | **827474** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 515627 | 251312 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 397443 | 189205 |
| Управленческие расходы | 040 | 26483 | 15774 |
| Расходы на реализацию | 050 | 8563 | 4790 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 060 | 83138 | 41543 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 76503 | 41680 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | -41221 | -12939 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 160 | 35282 | 28741 |
| Налог на прибыль | 170 | 3176 | 4145 |
| Прочие налоги и сборы, производимые из прибыли | 200 | 16 | 6 |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 32090 | 24590 |

### Информация по состоянию на 1 января 2013 года

| Показатель | Ед. изм. | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего<br>в том числе: юридических лиц<br>физических лиц | | 1437<br>24<br>1413 | 1437<br>24<br>1413 |
| Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | 1299,7 | 255,8 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 310,49 | 66,82 |
| Среднесписочная численность | чел. | 1409 | 1484 |

Данные отчетности подтверждены аудиторской проверкой ИП Семенкович Николай Николаевич, № 500589134 решение Сморгонского райисполкома № 777 от 26.09.2000 г.

*Генеральный директор* *Н.В. Манько*

*Гл. бухгалтер* *С.В. Пивовар*

## ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ»

| | |
|---|---|
| Учетный номер плательщика | 100120075 |
| Вид экономической деятельности | Сводный |
| Организационно-правовая форма | |
| Орган управления | Министерство транспорта и коммуникаций РБ |
| Единица измерения | млн.руб. |
| Адрес | 220099, г. Минск, ул. Кижеватова, 8 |

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2012 года**

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2012 г. | На 31 декабря 2011 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Основные средства | 110 | 139 166 | 119 659 |
| Нематериальные активы | 120 | | 2 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | | |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | | |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 999 | 3 677 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 3 419 | 3 419 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | | |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 350 | |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 241 | 78 |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 144 175 | 126 835 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | | | |
| Запасы | 210 | 11 805 | 14 591 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 8 888 | 6 804 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| незавершенное производство | 213 | 2 803 | 7 536 |
| готовая продукция и товары | 214 | 114 | 251 |
| товары отгруженные | 215 | | |
| прочие запасы | 216 | | |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 3 227 | |
| Расходы будущих периодов | 230 | 179 | 307 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 10 | 213 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 5 353 | 5 452 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 63 | 139 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 6 | 6 |
